**“Родны сэрцу горад мой…”:**

**Інтэлектуальная гульня, прысвечаная Мінску**

Гульня праходзіць у тры тры туры. У ёй можа прыняць удзел любая колькасць каманд, склад удзельнікаў – 6 чалавек. Пры правядзенні гульні можна выкарыстаць тэхнічныя сродкі і кожнае пытанне суправаджаць нагляднасцю.

**Тур 1 – “Алфавіт”.** У гэтым туры адказы на пытанні пачынаюцца паслядоўна на кожную літару алфавіта. На пытанні адказваюць усе каманды, якім перад пачаткам спаборніцтва выдаецца бланк адказу:

| | | |
|---|---|---|
| А | | |
| Б | | |
| В | | |

У другой калонцы бланка ўдзельнікі запісваюць адказ, у трэцяй выстаўляюцца балы. За кожны правільны адказ даецца адзін бал.

На абдумванне адказу адводзіцца 10 секунд.

А – Назавіце прозвішча ўраджэнца Мінска, лаўрэата Нобелеўскай прэміі. (Алфёраў)

Б – Гэты пісьменнік за сваё жыццё не напісаў ніводнага опернага лібрэта, але помнік яму стаіць менавіта каля Опернага тэатра. (Багдановіч)

В - У XIX ст. гэтая вуліца размяшчался амаль за гарадской рысай. Яе назвы – Лошыцкая і Серпухоўская. Сучасную назву яна атрымала ў 1922 годзе. Зараз на ёй знаходзіцца будынак архітэктара Рудольфа Пішчалы. Назавіце вуліцу. (Валадарскага)

Г – Назавіце аўтара зборніка “Матчын дар”, пісьменніка, якога сёння можна лічыць ураджэнцам Мінска. (Гарун)

Д – Спачатку гэта быў проста жылы дом. Па волі лёсу ён апынуўся на передавой палітычнай барацьбы, дзякуючы чаму і атрымаў сваю назву. Сёння ён успрымаецца хутчэй як помнік драўлянага дойлідства. (Дом I з’езда РСДРП)

Е – Яна ніколі не жыла ў Мінску, у яе прозвішчы засведчана месца яе жыхарства. Аднак у Мінску ёй пастаўлены два помнікі. А 17 кастрычніка 2007 года Нацыянальны банк РБ выпусціў срэбную манету, прысвечаную ёй. Назавіце яе імя. (Ефрасіння)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ж – Зараз у Мінску актыўна развіваецца жанр гарадской скульптуры. Назавіце аўтара трох скульптур, размешчаных у Міхайлаўскім скверы (пажадана прадставіць фотаздымкі). (Жбанаў)

З – Перад вамі ўрывак з рамана Г.Далідовіча «Пабуджаныя»: «Васілевіч ішоў не да сваёй кватэры, а ў іншы, супрацьлеглы, бок – праводзіў Муху. Вось моўчкі мінулі адзін з самых новых гмахаў у Мінску – касцёл Сымона і Алены». Па якой вуліцы ішлі героі? (Захараўская)

І – Гэтая вуліца знаходзіцца ў гістарычнай частцы горада. Яе паўднёва-заходняя частка ўзнікла ў XVI ст. і мела назвы Зборавая і Праабражэнская. Другая частка вуліцы называлася Валоцкая і Хрышчэнская. У 20-я гг. XX ст. яна атрымала новую, сацыялістычную назву. У 1950 г. на ёй быў пабудаваны першы пасля Вялікай Айчыннай вайны кінатэатр. Назавіце вуліцу. (Інтэрнацыянальная)

К – Памяць пра гэтую знакавую асобу беларускай культуры, бацьку беларускай нацыі, захавана ў намінацыях розных гарадскіх аб’ектаў: вуліцы, парку, станцыі метро. Назавіце асобу. (Купала)

Л - У гэтым парку самыя старыя ў Мінску дрэвы. Ліпавым алеям – 100-150 год. Як і ў любога старога парку, у яго ёсць сваё страшнае паданне. Нягледзячы на трагедыю, якая ў ім адбылася, ён застаецца самым рамантычным гарадскім паркам. Нездарма ў ім ёсць дрэва закаханых. Запішыце назву. (Лошыцкі)

М – Мара кожнага студэнта – атрымаць дыплом. Мара батаніка – вынайсці новы від раслін. Мара мастака – застацца ў гэтым будынку назаўсёды. Назавіце гэты будынак. (Мастацкі музей)

Н - У якое наваколле Мінска адправіцца англічанін, калі на радзіме яго адправілі ў Бедлам? (Навінкі)

О – Дзякуючы гэтаму мастаку, мы можам уявіць, як выглядалі мінскія храмы і вуліцы ў XIX ст. (Орда)

П – На якой плошчы размешчаны самы вядомы ў свеце мінскі помнік. Менавіта гэта помнік ў савецкія часы ўвасабляў сабой нашу сталіцу. (Перамогі)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Р – Побач з якім архітэктурным помнікам знаходзіцца самы шыкоўны бронзавы фаэтон? (Ратуша)

С – Помнік якому вядомаму дзеячу знік за адну ноч з Кастрычніцкай плошчы? (Сталін)

Т – Прадстаўнікі якога этнасу далі назву месцу, дзе яны сяліліся? У розныя часы гэтае месца называлася асада, канец, прадмесце, слабада. (Татары)

У - У якім мінскім раёне знаходзяцца дамы, упрыгожаныя мазаічнымі пано “Мінск – горад-герой”, “Мінск – горад-працаўнік”, “Мінск – горад навукі”, “Мінск – горад мастацтва”? (Усход)

Ф – Дзе размешчаны мемарыяльны музей Уладзіміра Мулявіна? (Філармонія)

Х – Назавіце прозвішча мастака, творы якога вельмі шырока прадстаўлены ў Мастацкім музеі (паказаць рэпрадукцыі). (Хруцкі)

Ц - У якой установе культуры пачаўся творчы ўзлёт аркестра пад кіраўніцтвам М.Фінберга? (Цырк)

Ч – Якому вядомаму нумізмату абавязана сваім з'яўленнем гэтая бутэлька (на фотаздымку паказаць бутэльку піва “Аліварыя”)? (Чапскі)

Ш – Яны ўпершыню з’явіліся ў Мінску ў канцы XIX ст., каб дапамагчы мінчанам арыентавацца ў горадзе. Зараз яны ёсць амаль на кожным будынку. (Шыльды)

Э – Якая мінская кнігарня сваёй назвай абавязана Архімеду? (Эўрыка)

Ю – Гэтая плошча носіць сваю назву 181 год. Некалі на гэтым месцы стаяў помнік ў гонар 1500-годдзя Нікейскага (Першага Усяленскага) сабора. Назавіце плошчу. (Юбілейная)

Я – Кожны год 2 сакавіка ў самым цэнтры Мінска збіраюцца людзі, каб успомніць адну з самых страшных падзей, якая адбылася ў 1942 годзе. Назавіце гэтае месца. (Яма)

**Тур 2 – “Брэйн –рынг”.** На абдумванне адказу камандам даецца 1 хвіліна. Адказвае каманда, якая першай падала сігнал. Калі дадзены няправільны адказ, астатнім удзельнікам даецца яшчэ 30 секунд для разважанняў. Кожны правільны адказ ацэньваецца 1 балам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Калі вы трапляеце ў любы еўрапейскі горад, вы лёгка палічыце адлегласць да любога населенага пункта, таму што адлік кіламетраў заўсёды пачынаецца ад паштовага аддзялення. У Мінску вы можаце памыліца на некалькі кіламетраў. Чаму? (Яшчэ адзін нулявы кіламетр на Кастрычніцкай плошчы)

2. Сёння жыхароў нашай сталіцы называюць мінчанамі, у 20-я гг. XX ст. часцей можна было пачуць мінчукі. А як называлі жыхароў старажытнага Менска? (Мяняне)

3. Лёс гэтага помніка архітэктуры незвычайны. Божы храм, потым храм мастацтва, потым зноў Божы. Назавіце прозвішча фунтадатара гэтага помніка. (Вайніловіч Э.)

4. Слуцк, Друцк, Полацк, Віцебск, Пінск. Як, абапіраючыся на гэтыя назвы, абгрунтаваць адну з самых папулярных версій паходжання назвы нашай сталіцы. (Усе гэтыя тапонімы маюць суфікс –ск-, што сведчыць, што яны атрымалі назву ад ракі. Мінск – горад на рацэ Менка)

5. Які сабор у Мінску мае тры назвы? Дзе ён размешчана? (Петрапаўлаўскі, Кацярынінскі, Жоўты сабор на Нямізе)

6. У скульптур герояў Я.Коласа плошчы не хапае адной важнай рэчы, без якой рэальнае дзеянне было б немагчыма. Якая гэта рэч? (У Сымона ў руках няма смыка)

7. На гербе Мінска змешчана выява іконы Божай Маці. Сваім з'яўленнем у нашай сталіцы ікона парушыла прыродны закон. Які? (Плыла супраць цячэння)

8. Осла – горад на рацэ Ло, Усцюг – горад на рацэ Юг, Дзюсельдорф – вёска ля ракі Дзюсель. Назавіце раён Мінска, у назве якога занатавана, што ён знаходзіўся каля воднага аб'екта. (Уручча)

9. Перад вамі фотаздымак Александрыйскага сквера. Аднак жыхары г. Мінска часцей называюць гэты парк іншай, неафіцыйнай назвай. Назавіце аўтараў і кнігу, герой якой стаў правобразам для ўтварэння неафіцыйнай назвы? (Ільф, Пятроў “Залатое цяля”. Сквер называюць Панікоўкай)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Перад вамі яшчэ адзін урывак з рамана Г.Далідовіча «Пабуджаныя»: «Муха ў задуменні выйшаў са сквера і па Петрапаўлаўскай вуліцы закрочыў да Праабражэнскай, каб трапіць на Саборную плошчу». Куды трапіў бы герой рамана сёння? (Плошча Свабоды)

11. У назвах якой вуліцы за час яе існавання занатаваны ўсе палітычныя і культурныя прыярытэты Беларусі? (Галоўны праспект Мінска – праспект Незалежнасці)

12. У Мінску ёсць будынак, які з усходняга фасаду пабудаваны ў стылі класіцызму, а з паўднёва-заходняга – у стылі мадэрн. Што гэта за будынак і дзе ён знаходзіцца? (Гасцінны двор на плошчы Свабоды)

13. Партызанка, воін, сялянка, інжынер. Дзе гэтая незвычайная кампанія сустракае гасцей сталіцы? (Насупраць чыгуначнага вакзала)

14. Тыя, хто служыць у гэтай установе, прызваныя абараняць краіну. А самі яны знаходзяцца пад аховай трох грэчаскіх багоў – Леты, Артэміды і Апалона. Назавіце будынак. (Будынак МУС на праспекце Незалежнасці)

15. Што, ці, дакладней, хто звязвае дом № 4 па вуліцы Камуністычнай і амерыканскі горад Далас? (Там жыў Харві Лі Освальд, забойца Д.Кенедзі)

16. У гэты будынак у пачатку XIX ст. равін хадзіў на працу. Сёння любы мінчанін можа прыйсці туды адпачыць. (Рускі тэатр)

17. Гэтыя два гарадскія аб'екты па сутнасці цёзкі і сваё імя атрымалі па сваёй форме. Толькі адзін носіць лацінскае імя, а другі – спрадвечна беларускае. (Цырк і Круглая плошча)

18. Гэтае месца заўсёды было месцам адпачынку. Нездарма на адным са слупоў была высечана лацінская фраза "Пасля працы – адпачынак". Тут у XIX ст. з'явіўся першы велатрэк, пляцоўка для тэнісу, кракета, кегельбана. Які помнік зараз знаходзіцца каля цэнтральнага ўваходу ў гэта месца? (Помнік Максіму Горкаму)

19. Гэты паэт амаль усё жыццё пражыў на захадзе ад сваёй радзімы. Аднак скульптар павярнуў яго тварам на ўсход. (Адам Міцкевіч)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

20. У гэтым будынку заўсёды вучылі. Спачатку клапаціцца пра захаванне веры і душы, у XIX ст. – закону Боскаму, сёння – захоўваць гонар – свой і Радзімы. Назавіце ўстанову. (Сувораўскае вучылішча)

21. Гарадская легенда расказвае, што архітэктару, які спраектаваў сядзібу заможнаму мінчуку, заказчык не заплаціў грошы. І тады архітэктар адпомсціў прагнаму багацею. У выніку ў Мінску з’явіўся цудоўны прыклад архітэктурнай пародыі. Як адпомсціў архітэктар і дзе размечшана гэтая пародыя? (Пабудаваў туалет у выглядзе сядзібы, будынак знаходзіцца каля тэатра імя Янкі Купалы)

22. Які помнік беларускай архітэктуры ў прамым значэнні гэтага слова знаходзіцца пад аховай беларускай арміі? (Бернардынскі манастыр, дзе размяшчаецца вайсковая камендатура.)

23. Паказаць фотаздымкі Акадэміі Навук і Дома афіцэраў. У якім стылі пабудаваны помнікі? (Канструктывізм.)

24. У які мінскі музей вас прапусцяць толькі калі вы пакажаце пашпарт? (Музей Нацыянальнага банка РБ.)

25. У якім храме на халерных могілках у другой палове XX ст. мінчане маглі слухаць класічную музыку? (Касцёл Святога Роха)

26. Сваё імя яны атрымалі па назве горада, дзе нарадзілася самая ўплывовая асоба ў свеце. Яны створаны для забавы і адпачынку людзей. Паміж імі кіламетры мінскіх вуліц і стагоддзі гісторыі. Дзе яны знаходзяцца? (Батлейка ў Беларускай хатцы. Кафэ “Батлейка”).

**3 тур – “Паняцці”.** Камандам прапануюцца шэсць паняццяў: Пісьменнік, Дойлідства, Вада, Мастак, Суполка, Святыня. Удзельнікам неабходна здагадацца, што ці хто схаваны за гэтым паняццем. Для гэтага прапануецца чатыры азначэнні паняцця. Калі каманада дала правільны адказ пасля першага азначэння, яна атрымлівае чатыры балы, калі пасля другога – тры і г.д.

Паняцці выбіраюцца па чарзе кожнай камандай. Права адказу мае толькі тая каманда, якая выбрала гэтае паняцце.

*Пісьменнік* (Цішка Гартны (Зміцер Жылуновіч))

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Памяць пра гэтага беларускага савецкага пісьменніка ўвасоблена ў назвах мінскіх вуліц двойчы: адна вуліца названы яго псеўданімам, а другая – сапраўдным імем.

2. Ён адным з першых у беларускай літаратуры звярнуўся да тэмы пралетарскай барацьбы, да жыцця працоўнага класа.

3. Ён быў першым старшынёй Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларускай ССР.

4. Паказаць фотаздымак.

*Дойлідства* (Палац Рэспублікі)

1. Каб сабраць грошы на будаўніцтва гэтага аб'екта, праект падзялілі на тры часткі: падземныя збудаванні, добраўпарадкаванне плошчы, архітэктурныя работы.

2. Будаўніцтва яго працягвалася амаль 20 гадоў.

3. У час будаўніцтва каля аб’екта з’явілася сцяна памяці Віктара Цоя.

4. Паказаць фотаздымак інтэр'ера.

*Вада* (Няміга)

1. Вядомы літаратурны помнік захаваў звесткі пра вельмі незвычайную жатву, якая адбылася на берагах гэтага воднага аб’екта.

2. Некаторыя лінгвісты назву гэтага воднага аб'екта перакладаюць як бяссонніца.

3. Па назве гэтага аб'екта называецца вуліца Мінска.

4. Сёння ён не існуе на паверхні зямлі.

*Мастак* (Язэп Драздовіч)

1. Для гэтага мастака ніколі не існавала пытання “Ці ёсць жыццё на Марсе”.

2. Ён працаваў выкладчыкам у Мінскай жаночай гімназіі.

3. Яго называлі вечным вандроўнікам. На яго малюнках мы бачым, як выглядаў Мінск у 20-30-я гг. XX ст.

4. Дзякуючы скульптару І.Галубовічу, ён назаўсёды вярнуўся ў Траецкае прадмесце.

*Суполка* (Дом масонаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Гэты будынак гістарычнай часткі Мінска ў класічным стылі зверху нагадвае абрысы грэчаскага крыжа.

2. Кажуць, што ў ім першапачаткова не было вокнаў, а былі толькі нішы, закладзеныя каляровым шклом.

3. Зараз у ім размяшчаецца Музей гісторыі беларускай музыкі і тэатра.

4. Легенда сцвярджае, што ён пабудаваны для ложы “вольных муляроў”

*Святыня* (Царква Аляксандра Неўскага)

1. Гэты архітэктурны помнік павінен наведаць кожны балгарын, які прыязджае ў нашу сталіцу.

2. Легенда расказвае, што ў час вайны ў гэты будынак трапіла бомба і не ўзарвалася. “Выратавала” ікона Міколы-ўгодніка.

3. Гэты помнік названы ў гонар святога і ваяра Рускай зямлі.

4. Гэты помнік можна ўбачыць на Вайсковых могілках.

Перамагае каманда, якая набрала найбольшую колькасць балаў.

Для падрыхтоўкі можна прапанаваці наступную літаратуру:

Шыбека З.В., Шыбека С.Ф. Мінск: старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. – Мінск, 1994.

Минск: энциклопедический справочник. – Минск, 1983.

Каляда В.І. Мінск учора і сёння. – Мінск, 1988.

Пазняк З. Рэха даўняга часу. – Мінск, 1985.

Шур В. З гісторыі ўласных імёнаў. – Мінск,1993.

Васілеўская А.С.

Залуцкая В.Л.

Бандарэнка Н.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ